Ба 51350



# Апавяданьне старшыні Вахненкі пра політразьведку

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва

Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна

Ба 51350
355.42

НА ВАРЦЕ СССР

Гр. ШТЭРН

ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА ТССР
ИНВ. № 506 1

# АПАВЯДАНЬНЕ СТАРШЫНІ ВАХНЕНКІ ПРА ПОЛІТРАЗЬВЕДКУ

Ба 51350
Бел. аддзел 1994 г.

Пераклаў В. Лёсік

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1930

25. 04. 2009

Заказ № 201. 5.000 экз. (1¼ арк.). Галоўлітбел № 54.

Друкарня Беларускага Дзяржаўнага Выд-ва.

## У разьведку.

Калі ў 3-м эскадроне рыхтаваліся на абед, у казармы зайшоў камандзір эскадрону. Дзяжурны падбег да яго з дакладам і тут-жа атрымаў загад: «Праз 5 хвілін сабрацца ў канцылярыі—політкіраўніку, камразьдзелаў, старшыні. Так... Няхай лекарскі памочнік і памочнікі камразьдзелаў таксама будуць. На абед няхай аддзяльком вядзе...»

Седзячы ў сталовай за доўгім, абабітым цыратай сталом, хлопцы разважалі, што гэта мае быць.

— Няйначай, як нейкае начальства прыяжджае,—кажа Лебяда—люісісты з 2-га разьдзелу, выцягваючы з бачка вялікі кавалак сала. Мне пісар з палкавога штабу казаў—камандзір корпусу павінен прыехаць—агляд будзе...

Кожны гадаў па-свойму. Нарэшце аддзяльком Уласаў, які даслужваў ужо другі

год і дзеля гэтага лічыў сябе знаўцам вайсковых парадкаў, сказаў:

— Напэўна на манэўры пойдзем. Надышоў час, як паказана ў пляне. Цяпер, хлопцы, з казармы на месяц, а то і на болей. Э-эх! Пратрасёмся... ой люлі! А то, праўда, застаяліся, як той конь на гліне [1]).

Паабедалі на гэты раз скора, на 15 мінут скарэй, як заўважыў той-жа Ўласаў. Карцела даведацца, што будзе.

Перад «мёртвым» часам памочнікі камразьдзелаў заявілі: «Сёньня адпачынку на паўгадзіны меней. Заўтра зраніцы наш эскадрон у разьведку. А шостай гадзіне палкавы сход. Кампалка будзе рабіць даклад а манэўрах. І ваенком таксама. А да шасьці рыхтавацца да выступленьня».

Пасьля адпачынку закіпела работа. Прывязвалі клункі да сёдлаў. Змазвалі зброю. Чысьцілі да бляску трэнзалі, спражкі. Скрэблі потнікі, каб сьпіну каню не набіць. Разьбіралі стрэльбы. Бегалі да капцёра, аружнага майстра. Лебяда прымяраў да

---

[1]) На гліну ставяць коняй з хворымі капытамі.

«люіса» новы бразэнтавы чахол. Эскадронныя абозьнікі ўкладалі прыпасы...

— На вячэ-э-ру!

Да паверкі засталося блізка дзьве гадзіны. Хлопцы распаўзьліся па казармах—хто куфэрак падправіць, хто статут яшчэ разок падчытаць. Чалавек трыццаць сядзела ў ленкутку і разважалі аб наступных манэўрах.

Успаміналі даклад камандзіра, як трэба працаваць у палявой абстаноўцы: манэўры—гэта праверка, ці здольны мы да сапраўднага бою. Успомнілі ваенкомаў даклад аб рабоце сярод насельніцтва. Комсамольцы ў кутку дагаварваліся ўжо, як зьвязацца з вясковай моладзьдзю.

Нехта па прывычцы стаў быў з трэскам пуляць шрацінкай у мішэнь з дзірачкамі—Чэмбэрлена з шкелцам на паўгалавы. Але скоры выезд засланяў сабою ўсе другія інтарэсы...

Упэўнена аратарстваваў Уласаў:

— Разьведка справа сур'ёзная. Для коньніцы—хлеб. Кепска выведаеш—увесь полк, а то і цэлую брыгаду падвядзеш. Памятаю,

я летась з разьездам хадзіў... В-во папрацавалі... Раз 90 вёрст за дзень адмералі... А ну, хлопцы, як бакавы дазор ходзіць?

Гэта мы ведаем. І на эскадронных занятках і палкавых прыходзілася чуць—сказаў комсамолец Гудзь.—Я табе наконт разьведкі з статуту напамяць вылажу. Вось наконт політразьведкі я ня зусім разабраўся. У статуце мала, да і камразьдзелу на лекцыях неяк ня ўсё сказаў. А справа не маленькая.

Гудзя падтрымалі. У пытаньнях політразьведкі ўсе адчувалі сябе слабавата, а ведаць трэба. Шкадавалі, што камразьдзелаў і політкіраўнік сёньня рана разышліся дахаты—рыхтавацца да выступленьня.

— Давайце старшыню паклічам—Вахненку. Ён раскажа. Нядарма ён два месяцы ў нас політкіраўніка замяшчаў, ды за нормальную школу рыхтуецца здаваць. Сходзі хто па яго.

— І то праўда. Старшыня растлумачыць, што і як. З галавою хлопец і грамадзянскія фронты з 18-га году ўсе перамераў.

Старшыню Вахненку, звыштэрмінавіка 1900 году нараджэньня, байца, які бачыў віды, у эскадроне вельмі паважалі.

Ня любілі яго спачатку хлопцы за строгасьць і патрабавальнасьць. За вочы нават Чжанцзолінам[1]) дражнілі. Потым прывыклі і моцна палюбілі. Умеў Вахненка і націснуць, дзе трэба і да парадку прывучыць. Умеў і сьпяваць, і скакаць з чырвонаармейцамі, і пагаварыць. Ну, і справу ведаў, ды баец стары, партыец вытрыманы. Калісьці і ў пяхоце служыў. Словам, прайшоў агонь і мядзяныя трубы.

Вахненку знайшлі ў капцёрцы. Старшыня даваў свае досыць важкія наказы памочніку камразьдзелу Суравежкіну, які застаўся «начальнікам разьдзелу», ня ехаў на манэўры. Надоечы Суравежкіну ў маняжы конь нагу прыціснуў.

Старшыня ўжо канчаў наказ: «... Глядзі, хворых коняй кожны дзень на пункт вядзі. Хлопцы, якія застаюцца, каб тут бяз нас не

---

[1]) Чжанцзолін— кітайскі генэрал, кат рабочых і сялян, зьлейшы вораг кітайскіх комуністых.

распусьціліся. Ты цяпер як намесьнік камандзіра эскадрону будзеш. Ня жарты табе...»

Выслухаўшы «дэлегата», Вахненка згадзіўся і пашоў у ленкуток.

Як прышоў старшыня, спрэчкі ў ленкутку сьціхлі. Гудзь пабег склікаць усіх комсамольцаў, каб паслухаць. Яго ўгаворы, што «гэта ў парадку саюзнай дысцыпліны», былі не патрэбны: бывалага старшыню любілі паслухаць.

Праз некалькі хвілін быў поўны пакой— «да адказу». Нават эскадронны «бузацёр» Сямёнка, шустры хлопец, заўсёды ні з кім нязгодны, і той, не знайшоўшы другога вольнага месца, залез на вакно.

— Што-ж вам расказаць?—пачаў Вахненка.—Мажа будзе лепш гэтак—кажы, што каго цікавіць. Вось я і буду ведаць, што вам вытлумачыць.

Як гарох, пасыпаліся пытаньні. Усіх перакрычаў крыху насьмешлівы голас Сямёнкі:

— Спачатку сказаў-бы ты, на які чорт патрэбна яна, політразьведка? Нашто?

А то тут нешта незразумелае. Усёроўна як ДПУ, ці як?

Калі ўсе пытаньні былі скончаны, Вахненка запрапанаваў:

— Так вось я запісаў важнейшае. Паслухайце, ці ўсё запісаў: першае пытаньне таварыша Сямёнкі—нашто патрэбна палітразьведка. Ну, і Грышчын дадаў: сярод каго яе весьці. Потым тав. Гудзя пытаньне—хто робіць палітразьведку і далей яшчэ—як рабіць. Гэтак я і буду расказваць. А каб маркотна вам ня было, раскажу вам тое, што я сам бачыў.

## Нашто патрэбна палітразьведка і дзе яе трэба рабіць.

... Было гэта вясною ў 1920 г. на польскім фронце. Даўно ўжо. Служыў я тады ў пяхоце ў 151 стралковым палку, у пешай разьведцы. Часова камразьдзелу нашага замяшчаў, ранены ён быў. Стаялі мы за Барысавам—дывізіяй фронт займалі. Перад тым скрыху пагналі нас белапалякі, ну, а тут сталі мы моцна. Загад быў—далей ані шагу

назад. Нават так—гэта паміж хлопцаў—чутка хадзіла: скора мы наступаць будзем.

Клічуць мяне пад вечар у штаб палка,—ад'ютант, кажуць, патрабуе. Тады яшчэ ў палку начальніка штабу ня было—ад'ютант круціў...

Падцягнуў я свае абмоткі (па-пешаму хадзілі), абтрос пыл, далажыў начальніку свайму і пашоў у штаб. Стаяў ён на краю сяла ў клуні, проста на сене. Тут і тэлефон, тут і камандзір з камісарам сьпяць.

Пасадзіў мяне поплеч ад'ютант ды кажа:

— Вы, таварыш Вахненка, кажуць, барысаўскі?

— Барысаўскі,—кажу.

— І Гнілапятава сяло ведаеце, дзе вораг стаіць?

— Бываў,—кажу,—калісь, нават знаёмыя ёсьць.

— Ну, дык вось вам заданьне: прыбярэцеся мужычком, калі трэба—пару хлопцаў вазьмеце і, як сьцямнее,—марш у Гнілапятава. Ёсьць у нас весткі, што варожыя часьці там зьмяніліся. Камандзір брыгады загадаў даведацца. Дык вось выведайце, які там

полк стаіць, гармат колькі, кулямётаў. Ды яшчэ ў рэзэрве ў іх там колькі... Зразумеў?

Я сказаў, што зразумеў, ды пашоў. Узяў аднаго хлопца, таксама беларуса, Кабасэвіча—хлапчына быў хоць куды. Ня ведаю, дзе ён цяпер. Апранулі мы сярмяжкі, ды і махнулі, куды загадана. Шчыльнага фронту тады ня было, і прайшлі мы лёгка. Ідзем мы сабе па вуліцы, як нібыта таго, сярод палякаў. Падлічваем, што на вочы пападаецца. Гляджу, насустрач мужычок знаёмы, калісь на фабрыцы папяровай разам на рабоце былі. Ён пазнаў. Я яму ківаю—не падводзь. Ну, свой хлопец трапіўся, стаў я яго распытваць. А ён кліча мяне да сябе ў хату: «Там афіцэры стаяць. Паслухаеш, што трэба». Мужычок быў надзейны. Пашоў я з ім, а Кабасэвічу сказаў яшчэ пахадзіць.

Сядзімо мы ў хаце, ядзім вараную бульбу. Аж два афіцэры ўваходзяць і па-польску паміж сабою гавораць. Я разумеў крыху па-польску. Трохі спалохаўся я, а вушы настаўляю. Палез на печ ды слухаю. А гутарка ў іх такая была: «Вялікі ў нас полк, на-

роду звыш дзьвюх тысяч, дзьве батарэі і кулямётаў многа, але страхам людзей у руках трымае. Ненадзейная публіка, таго і глядзі, што ваяваць ня будуць. І ў палон не здаюцца толькі дзеля таго, што баяцца—бальшавікі расстраляюць. Гэта не пазнанцы [1]). Асабліва беластоцкія рабочыя, проста бальшавікі». Павячэралі паны, выпілі ды ляглі спаць. Веставога дзяжурыць паставілі, каб будзіў, калі трывога.

Я тады з хаты вон, сустрэў Кабасэвіча, і шчасьліва досьвіта яшчэ вярнуліся да сваіх. Вестак хопіць. Дый Кабасэвіч дадае—фронт у іх адзін батальён трымае, позыцыю, ды два ў рэзэрве. Расказаў яшчэ пра гутаркі салдат: «ваяваць з сваімі ахвоты мала. Лепш пілсудчыкаў [2]) пабіць ды павярнуць штыкі». Казаў яшчэ, што шмат салдат гаварылі па-беларуску. Полк называецца 37.

Але ўсе гэтыя чуткі мяне мала цікавілі. Памятаў ад'ютантава заданьне: колькі войска, гармат, кулямётаў, які полк, які рэзэрв.

[1]) Пазнанцы і легіянэры—лепшыя польскія часьці ў 1920 г.

[2]) Пілсудчыкі—верныя služкі маршала Пілсудзкага, зьлейшага ворага СССР.

Пабудзіў я ад'ютанта, выслухаў ён мяне, запісаў, а пытацца—нічога ня пытаўся, сонны быў. Толькі і сказаў: «Нямала іх, чарцей, цяжка тут будзе».

Праз дзень пашла наша дывізія ў наступленьне, адно не на нашым вучастку, а на правым крыле. Не ўдалося наступленьне, нарваліся на легіянэраў, тыя ўпарта біліся і прышлося адыйсьці ў ранейшае палажэньне. І страты былі немалыя.

Узяла мяне развага. Хоць і малы я чалавек, а розныя мысьлі ў галаве хадзілі. Пашоў я к ваенкому—просты быў хлопец—рабочы. Кажу яму: «Такая ў мяне, тав. камісар, думка, што ня там мы наступалі, дзе належыць».

І расказаў пра ўсё, што полк процію нас стаіць ненадзейны. Ускіпеў ваенком: «А чаго раней маўчаў, галава?» Я кажу: «Што загадана было—зрабіў». Паехаў ваенком сам са мною ў штаб брыгады, акуратна там мяне зноў распыталі: і пра афіцэрскую гутарку, і пра беларусаў-салдат, і пра рабочых. Ізноў аблаялі ды казалі—і ад'ютанту нагарыць, як трэба.

Якраз тут трэба было і наступаць.

Раней, як кончыць, раскажу вам, што далей вышла. Да ночы наша дывізія прыслала лістовак на польскай і беларускай мове. Адозвы да гэтага самага 37 палка. Пра ўсё там было—і што палонных мы не чапаем, няхай не баяцца, і што мы ўсім нацыянальнасьцям свабоду даем. Усё, як трэба, напісалі. Растыкалі іх уначы хлопцы ўсюды, нават ізноў у вёску занесьлі.

А раніцай самалёт выляцеў і таксама параскідаў лістоўкі над іхнымі палкамі.

За дзьве ночы іх да ста чалавек да нас перабегла, а праз тыдзень генэралы 37-ы полк у тыл адаслалі—уціхамірваць.

Вось, хлопцы, якая справа была. Разумееце, цяпер, на што політразьведка? Можа хто скажа?

Захараў, аддзялькам, устаў:

— Папрабую я як-бы вывады зрабіць, а што прапушчу, няхай хлопцы дабавяць. Першае скажу: каб камандзіры нашы ведалі, куды лепш ударыць,—ня толькі колькасьць ворага, а і што ён думае ведаць трэба. Які, значыць, настрой, якой нацыяналь-

насьці, рабочых колькі... Ну, далей—гэта пакажа і якую сярод іх палітычную работу весьці. Прамаргаў ад'ютант, як заданьне даваў, ды, выбачайце, і старшыня наш позна ў галаву за розумам палез. Вось што я, значыць, думаю.

— А я-б яшчэ сказаў,—дадаў Гудзь,— што калі ў разьведку ідзеш, павінен ты пашто калі ў разьведку ідзеш, павінен ты падумаць і палітычныя весткі аб супраціўніку выведаць, асабліва партыец наш і комсамолец. Даведаўся аб чым патрэбным ці дастаў што, далажы зараз-жа—згодзіцца.

## Як памог чырвонаармеец Пятрушын цэлай арміі.

Раскажу я вам, хлопцы,—казаў далей Вахненка,—яшчэ пра адно здарэньне. Таксама па гэтай справе. Служыў у нас у палку чырвонаармеец Пятрушын, у коннай разьведцы. Радавы баец, а ордэн Чырвонага Сьцягу меў. Цяпер палітычную школу скончыў і недзе, чуў я, палітківраўніком служыць. Толькі двое і было іх у палку з ордэнамі: ён і камандзір палка. Усе хлопцы

хацелі ведаць, за які ўчынак Пятрушыну нагарода такая вышла, але ня любіў хлопец многа гаварыць. Толькі ў гадавіну Чырвонай арміі 23 лютага і даведаліся мы. Расказаў ваенком на ўрачыстым сходзе (яны калісь у адным палку былі).

— Родам Пятрушын быў сібірскі селянін-бядняк. Служыў у 1919 г.—не памятаю ўжо ў якім палку—на калчакоўскім фронце. Вельмі добры баец быў: дзе мітынг ці сход партыйны, лекцыі ў школе граматы—ніколі не прапусьціць. Усё сядзіць ды слухае, ды нейкія каракулькі ў кніжку сваю піша. Ну, і па службе быў вельмі прымерны чырвонаармеец, і ў баі ня дрэйфіў—заўсёды наперадзе. Сакратар ячэйкі ня раз яму казаў: «Увайшоў-бы ты, Пятрушын, у партыю. Думаю, што з цябе толк будзе». Але Пятрушын адказваў, што малапісьменны яшчэ, падвучыцца, паслухае, а тады пойдзе.

У адной бойцы асколкам гранаты раніла Пятрушына ў нагу, няцяжка. Зваліўся ён у жыта. Нашы адышлі, а яго не заўважылі. Забралі яго калчакоўцы ў палон.

Хацелі яго забіць, але выратаваў белы унцер: ён мобілізаваны, кажа,—што з яго возьмеш. Адаслалі хлопца ў тыл. Паправіўся ён, скора запісалі яго ў нейкую часьць. Яны гэтак часта з нашымі палоннымі рабілі. Падгаварыў Пятрушын яшчэ двух хлопцаў і ўцёк з адміральскай [1]) службы. Надумалі праз фронт да сваіх прабрацца. Многа вёсак прайшлі, усюды прыслухваўся Пятрушын, што народ думае, як прыхільны да калчакоўскай улады. Запісваў нават, што ў кожнай вёсцы чуў—ці на таргу, ці так у хаце, дзе начаваў. Усё выведаў, дзе чырвоныя партызаны ёсьць, нават пару адозваў партызанскіх узяў. А народ тады з кожным днём супроць калчака абураўся. Усе хацелі на дапамогу Чырвонай арміі пайсьці.

Хоць і небясьпечна было, а цягаў усё на сабе Пятрушын, у ватоўцы хаваў.

Удалося яму назад да сваіх вярнуцца. Толькі калі праз фронт ішлі, белыя застрэлілі аднаго яго таварыша. Знайшоўшы свой полк, ён адразу да камандзіра з дакладам—

1) Калчак быў адміралам. Пры Міколе II камандаваў Чорнаморскаю флётаю.

TURKMENISTAN
Туркменская государственная библиотека

усё акуратна далажыў: як сяляне супроць белых настроены, і ў якім сяле і павеце больш, а дзе менш, дзе партызаны ёсьць, адозвы іх аддаў і каракулькі ўсе з кніжкі свае паказаў. Знаў яго камандзір, як вернага байца, адаслаў у політычны аддзел дывізіі. А там яшчэ сякія-такія весткі былі. Зьверылі іх,—здаецца, ня брэша хлопец, а вельмі важныя навіны прынёс. Аж да камандуючага арміяй даклад дайшоў.

Пастанавіў камандуючы не марудзіць, а ўдарыць адразу і стукнуць па белых. Хоць сіл сваіх мала, але спадзяваўся—сяляне сібірскія падтрымаюць. І галоўны ўдар накіраваў якраз у тыя паветы, дзе, як казаў Пятрушын, асабліва на белых сярдзіты сяляне.

І добра вышла. Як пачалі нашы наступаць, усе сяляне паўсталі. Б'юць дробныя часьці Калчака, рэжуць правады, робяць крушэньні на чыгунцы, не даюць падвод. Напалову белую армію аслабілі. Разьбіла Чырвоная армія і белых і чэхаў.

Далёка яны назад адышліся, але потым ачухацца не патрапілі.

Не адзін, разумеецца, Пятрушын тут памог, і другія весткі былі, вельмі карысна прыдалося і тое, што ён прынёс. А найважней тое, што дакладныя весткі ён дастаў. Нагрaдзілі яго за съмеласьць ды за кемнасьць ордэнам Чырвонага Сьцягу. Добрую хлопец політычную разьведку зрабіў.

— Што, хлопцы, на гэта скажаце?

Тут Гудзь выскачыў ды кажа:

— Каб нашы дзеяньні разьлічыць, заўсёды ведаць трэба, што думае насельніцтва ў тылу ворага. Хто—за, хто—супроць. Падтрымаюць яго ў адказную хвіліну ці не. І мы павінны заўсёды старацца ня толькі праціўніка, але і тыл яго выведаць політычна.

— І я дадам, таварыш старшыня,—сказаў аддзялько́м Захараў,—лічу я, што правільна Пятрушын зрабіў, што дакладна аб усім даведаўся: у якім сяле і павеце што народ гаворыць, ды адозвы прынёс. Калі весткі політычныя даеш, заўсёды трэба старацца дакладней усё расказаць, а яшчэ лепш — дакументы прынесьці: лістоўкі, пісьмы, газэты з таго боку.

б 51350
БССР Бібліятэка імені Леніна

— Абодва правільна падкрэсьлілі,—сказаў Вахненка,—а асабліва заўважыць трэба апошнія словы Захарава: каб весткі тваё добрыя былі, не ганяйся за ўсім, а дакладна выведай, дзе што было, і сяло назаві, і доказы прынясі. Толькі такім весткам і паверылі Пятрушыну.

— Ну, колькі цяпер часу? Дзевяць без дзесяці хвілін. Цэлая гадзіна, значыцца, да праверкі. Хочаце яшчэ паслухаць?—запытаў старшыня.

— Просім, таварыш старшыня, да самага сыгналу. Да канца ўсё ведаць трэба,—хорам адказалі чырвонаармейцы.

— Ну, добра, раскажу вам яшчэ.

## Чаму аднойчы нашаму аддзелу ад бандытаў папала.

Каб ваяваць з посьпехам, мала ведаць толькі праціўніка і палітычны настрой таго насельніцтва, дзе ён стаіць. Трэба заўсёды дакладна выведаць, што думае жыхарства і ў раёне нашага распалажэньня.

Пасьля замірэньня з палякамі наш полк перакінулі на Украіну—барона Урангеля дабіваць ды кулакоў-бандытаў уціхамірыць. Выгрузілі нас у горадзе Кацярынаславе. Цяпер Днепрапятроўск называецца, так зваць усеукраінскага старасту—Рыгора Іванавіча Пятроўскага.

Бандытаў навокал так і кішэла, не хацелі куркулі (кулакі, значыць) хлеба даваць, дый пятлюраўскія агенты там шныпарылі. Урангель да самага гораду дабіраецца, а ў тылу шайкі розныя пагульваюць: і Махно, і Валодзін, і Брова—усіх не пералічыш.

Выдзелілі з нашага палка зьнішчальны аддзел—банду Бровы зьнішчыць. І я туды папаў.

Загадалі нам ісьці ў сяло Крынічкі—адтуль шмат хто ў Бровы быў. Ад Крынічак і трэба было пачынаць дзейнічаць. Ісьці вёрст сорак. Пастанавіў наш камандзір наперад кватэрных паслаць. А дзеля таго, што малую часьць пасылаць было небясьпечна, дык вызначылі два разьдзелы з кулямётамі. Кватэрным было заданьне (старшым—камандзіра роты паслалі) ня толькі аддзел

разьмеркаваць, але разьведаць усё ў сяле да кроплі: як сяляне настроены, колькі куркулёў, колькі ў бандыты пашло. Яшчэ ім загадана было так аддзел разьмеркаваць, каб у кучцы ўсе былі, каб скора маглі да бою прырыхтавацца. Вялікае сяло, як Масква—на сямі ўзгорках.

Спатыкаюць наш аддзел пры ўваходзе ў сяло кватэрныя. Дакладваюць камандзіру: сяло багатае, але да Чырвонай арміі адносяцца добра—гатовы і байцоў пракарміць і разьмяркованы лік продуктаў здаваць. Брову больш не памагаюць і куды той пашоў—ня ведаюць. А хто быў у бандзе—бадай-што ўсе паварочаліся назад. Вось мы нават кватэры па ўсяму сялу разьбілі—чалавекі па два на хату. Няхай хлопцы адпачнуць ды падкормяцца ў гаспадароў.

Нахмурыўся камандзір, але паверыў, ну і час, ужо зьвечарэла, ад хадзьбы ўсе памарыліся. Ня ведалі мы тады бандыцкіх хітрыкаў. Разьмеркаваўся аддзел, як лепей ня трэба. Больш у багатых хатах. Добра ўсюды—ячня з салам, галушкі ў сьмятане, сена свежага паслаць нясуць.

Праўда, прабраўся цішком да аднаго камандзіра аддзяленьня бедны мужычок, кажа—у «камнезаме» [1]) раней быў, хаваецца цяпер у галубятні: угледзяць—заб'юць.

Кажа: «Ня верце, што добра прымаюць. Гэта вам вочы замазваюць. Багатыры намалі нешта крывавае, а бедната маўчыць—кожнаму жыць хочацца. Казаў я вашым кватэрным—не паверылі. Скажэце старшаму ў вашым палку. Я ўсіх ведаю і скажу—хто за бандытаў».

Пасьмяяўся аддзяльком: «Не да цябе камандзіру. Наеўся ды сьпіць ужо, мусіць».

Збрахаў аддзяльком—ня спаў камандзір, паставіў сям-там варту ды патрулёў на вуліцах. Але мала назначыў, ды і цемра чорная, мясцовасьць незнаёмая — куды каго ставіць?

Пасьля хадзьбы і добрай вячэры ўвесь аддзел заснуў. Ціш у сяле. Чуваць толькі—сабакі брэшуць.

---

1) Камнезам—камітэт незаможных (бедных) сялян. Організацыя вясковай бедноты на Украіне. Горача стаялі за сав. ўладу процi вясковых кулакоў.

А гадзіне трэцяй пачалося. Бандытаў, мабыць, многа вярнулася, але не саўсім прышлі, а так па прыпасы ды па навіны. Сабраліся яны кучкамі. Што ім ноч—кожны кусьцік знаёмы. Караульных падушылі, напалі на штаб, на трыбунал, што з намі езьдзіў, і на хаты, дзе стаяць камандзіры. І гаспадары-кулакі памагаюць: дзьверы адчыняюць, аружжа ў сяго-таго прыхавалі. Стральба паднялася ў цемнаце. Людзі бегаюць па аднаму. Страляюць. Ніхто ня ведае, куды ісьці, што рабіць. І зборнае месца было на выпадак трывогі, але дзе-ж яго ў цемнаце знойдзеш.

Большасьць бегла за сяло, у поле. Толькі а 8-й гадзіне раніцы злажыўся аддзел ды зноў забраў сяло бяз ніякага супраціўленьня. А бандыты павыходзілі ды пахаваліся.

Дорага заплацілі мы за тое, што паверылі, і за хібу кватэрных і аддзялькома, да якога прыходзіў бядняк: не далічыліся 37 байцоў, аднаго члена трыбуналу ды трох камандзіраў, а разам з імі старшага кватэрнага. Шмат каго амаль не на кускі бандыты парэзалі. Бачылі мы шмат чаго, а тут я і

глядзець ня мог: галава асобна ляжыць, зубы страшна выскалены, вантробы ў пяску валяюцца...

Ня буду гаварыць, што далей было; і так відаць, чаму так вышла. Хто выказацца хоча? Што тут за памылка была?

— Я скажу,—сказаў з падаконьніка люісісты Лебяда.—Уся бяда тут вышла з таго, што кепска політразьведку зрабілі. Трэба было глыбей пакапацца, ня верыць ваўком, што авечкамі папрыкідаліся. Трэба было патрапіць да бяднейшых падыйсьці, ды прытым надзейных людзей знайсьці. Даведацца, хто ў бандыты пашоў, перапісаць усіх, хто вярнуўся, нават арыштаваць ня кепска было-б. А што важней, дык гэта куркулёў у заложнікі ўзяць. Каб практычныя былі, то даведаліся-б пра ўсё—нашых людзей, спачуваючых і ня трусоў, у сяле заўсёды знайсьці можна.

— А я лічу,—ізноў уставіў свае слова Гудзь,—каб раней аб усім даведаліся, чым сялянства цікавіцца, што іх абходзіць, то можа ўсяго гэтага і ня было-б. Склікалі-б сялян хоць-бы ў школу, калі цёмна,—рас-

талкавалі-б ўсё, чаго прышлі. Можа шмат хто і зусім ад бандытаў адстаў-бы.

— Усё гэта правільна,—сказаў старшыня,—адно вось яшчэ пра што забыліся: разьведка павінна быць без перапынку. Так, ці не? Ну, і палітычная таксама. Усе мы «добрыя» былі, што супакоіліся на разьведцы кватэрных. А аддзяльком проста злачынства зрабіў: дастаўшы такія важныя весткі, не данёс аб іх камандзіру. Ці-ж было-б такое няшчасьце, калі-б камандзір ведаў, што гаварыў бядняк?

— Зразумела, не!—загуў хор галасоў.

## Хто робіць палітычную разьведку.

— Дазвольце мне слова, таварыш Вахненка,—сказаў Сямёнка.—Вось гаварылі вы нам пра здарэньні з свайго вайсковага жыцьця. І праўда, правільна ўсё, што калі ня будзеш ведаць, як праціўнік ды насельніцтва настроена, дык часта можна ў бяду папасьці. Адно вось, здаецца мне, што трудная гэта рэч—політразьведку вясьці.

часта будзе звычайнаму чырвонаармейцу і не пад сілу. Просім вас растлумачыць, хто гэту політразьведку рабіць павінен.

— Ну, добра, раскажу вам, — сказаў старшыня, — хто політразьведку робіць. Праўду кажа тав. Сямёнка, што справа гэта трудная. Нямала трэба кемнасьці, каб правільна ацаніць палажэньне.

Вядуць гэту справу нашы політычныя аддзелы, камісары і штабы. Яшчэ ў мірны час дасьледуюць яны ўсё, што ў буржуазных дзяржавах робіцца. Асабліва пільна сочаць яны за тымі, хто можа стаць бліжэйшым нашым праціўнікам. Дзеля гэтага знаёмяцца яны з апісаньнем гэтых краін, — з газэт, з кніг розных. Знаёмяцца з іхнай арміяй і з жыцьцём насельніцтва. І ў часе вайны ворага свайго як найлепш пазнаць стараюцца. Адно як-жа ім у баявых абставінах пазнаць, скажам, нашай дывізіі, якое ў праціўніка войска супроць нас стаіць, або што думае насельніцтва. З адных толькі кніг аб гэтым ніяк не даведаешся. Шмат што мяняецца скора: скажам, зьмяніў вораг свой полк, во і дазнайся, з кім маеш справу. Без разьведкі,

ня ведаючы дзе вораг, колькі яго, і дня не праваюеш. Гэтак і без палітычнае разьведкі, ня ведаючы, чаго вораг твой варт, таксама дабра не чакай.

Дзеля гэтага, палітычная разьведка павінна весьціся без перапынку, пазьменна і з праверкай, як і ваенная разьведка. Паглядзім цяпер, каму-ж яе даручаюць.

Перш за ўсё, калі паслалі якую часьць на разьведку, яна павінна здабываць і палітычныя весткі.

Пойдзе, напрыклад, наш эскадрон. Едзе селянін—зараз-жа яго апытаць трэба: як часьці варожыя—крыўдзяць народ ці не, якой нацыянальнасьці і іншае.

Сялом едзеш—таксама, хоць мала часу, а сёе-тое аб гэтым сяле распытаць трэба. Палоннага якога злавілі ці забітага знайшлі, газэты якія белагвардзейскія валяюцца, усе паперы, якія знойдуцца,—усё трэба адаслаць начальству. Яно разгледзіць—можа згодзіцца што.

Кіраваць палітразьведкай памагае камандзіру палітработнік або сам гэту справу

вядзе. Бывае яшчэ, калі заданьне важнае, у аддзел разьведкі прызначаюць і спэцыяльнага політработніка для зьбіраньня патрэбных вестак.

Здараецца і так, што пасылаюць асобную політычную разьведку, аднаго політработніка або некалькіх—без вайсковай разьведкі.

Вось, скажам, полк наш пасьля баёў адводзяць на адпачынак.

Раён прызначаюць, дзе стаяць. Ну, і пашле камісар спэцыяльных людзей, найбольш растаропных, дакладна азнаёміцца з новаю стаянкай. Прыдзе полк, і ведаць будзе, дзе знаходзіцца.

Політразьведчыкам кожны павінен быць: і камандзір, і політработнік, і чырвонаармеец. Простаму чырвонаармейцу гэта часта лягчэй за ўсіх бывае: стане ў дзядзькі якога на кватэры,—той яму ўсё і раскажа, бо камандзіру часам і пабаіцца.

Ну, аб партыйцах ды комсамольцах і гаварыць няма чаго: дзе ні бывае, заўсёды павінен найлепш з абставінамі азнаёміцца.

Усе вайсковыя часьці могуць політразьведку рабіць—і пяхота, і кавалерыя, і інжынэрныя войскі. Як прыклад возьмем нашых сапёраў. Часта на вайне даручаюць пад іх кіраўніцтва многа мясцовых людзей, мобілізаваных: дарогу паправіць, мост наладзіць, акопы выкапаць. На агульнай рабоце заўсёды павінны яны выведваць, як насельніцтва да іх і да праціўніка адносіцца, скаргі якія, хто наш, а хто ня наш.

Цяпер давайце разьбярэмся, як можа памагчы чырвонаармеец у політычнай разьведцы. Таварыш Сямёнка як быццам ня верыць. Дзеля гэтага паглядзім:

## Як трэба весьці політразьведку і якія здабываць весткі.

Ёсьць розныя для гэтага сьцежкі. Возьмем для пачатку сваю асабістую асьцярогу. Ішлі вы дазорам ці разьездам, бачыце—колюмна праціўніка падходзіць. Ёсьць такое месца, дзе і схавацца можна і падгледзець. Што спачатку будзеш рабіць? Палічыш, колькі ідзе войска, пушкі, кулямёты. Ды гэ-

тага мала, трэба яшчэ зьвярнуць увагу, як яны ідуць. Стройна ідуць, песьні сьпяваюць, — бадзёры, значыць, настрой. Расьцягнулася колюмна, ззаду цягнуцца, за кусты ходзяць—відаць, змарыліся і дысцыпліна няважная.

Едзеш па дарозе, дзе праціўнік ішоў, коні здохлыя валяюцца, калёсы бяз колаў, мука рассыпана—усё заўваж і далажы, усё гэта можа на карысьць пайсьці. Відаць, скажам, што ў паніцы белыя беглі. Значыцца, гнаць яго трэба, ня даць паправіцца.

Стаімо мы доўга на месцы. Ні вораг нас, ні мы яго зрушыць ня можам. Заўважыў ты, што фабрычны комін ззаду ў ворага ўсё дыміўся, ды раптам перастаў, — таксама зьвярні ўвагу, чыю трэба. Можа гэта паказвае, што адступаць ён зьбіраецца і фабрыку спыніў.

Зразумела, адных гэтых вестак мала, але не адзін ты іх зьбіраеш, а многа хто. Дастануць камандзір з камісарам з усіх бакоў весткі, зьвераць, вось і могуць ужо падрабязныя вывады зрабіць.

Шмат чаго дабіцца можна апытаньнем сустрэчных людзей. У грамадзянскую вайну часта бывала, што сяляне праз фронт прабіраліся, або з падводай дадому варочаліся. І ў будучыні гэта здарыцца можа. Едзеш у разьведцы,—бачыш—з боку праціўніка чалавек ідзе. Зараз-жа трэба яго спыніць, апытаць, а яшчэ лепш, пасьля гэтага бліжэйшаму начальніку яго даставіць. Яшчэ і шпіёнам можа быць.

У гутарцы аб карысных рэчах даведацца можна. На рынку з селянінам разгаварыўся, у хаце, дзе начуеце, з гаспадаром, а то і ў дарозе, калі цябе селянін вязе. Трэба пагаварыць з ім, па-сяброўску падысьці, як народ настроены, што народ гаворыць, як белае войска, што вышла—крыўдзілі ці не, дысцыпліна ў яго якая. Сярод сялян многа старых салдат; ён табе такую карціну нарысуе праўдзівую, што падчас вочы вылупіш. Яму збоку больш відаць.

У такой гутарцы, я ўжо казаў, лепш каго другога просты чырвонаармеец зможа ўсё выведаць. Да яго мужычок бяз хітрыкаў.

Толькі адно разумей, як Пятрушын рабіў, што нагароду дастаў: заўсёды старайся дакладныя словы запомніць і, калі можаш, то і ў кніжку сабе запішы.

Але лепш і карысьней за ўсё—гэта дакуманты дастаць. І ў гутарцы, і нават пры асабістым назіраньні памыліцца можна, або далажыць нядобра. Ну, а дакумант рэдка падвядзе. Якія-ж, па-вашаму, дакуманты патрэбны будуць начальству, каб аб ворагу судзіць?

Трэба пісьмы ўзяць у забітага або раненага салдата ці афіцэра, запісныя кніжкі, газэты, пасьведчаньні, што пры ім знойдуцца.

У пісьмах часта пішуць, як жыве войска, чым яго кормяць, і нават калі наступаць ці адыходзіць зьбіраюцца.

Лістоўка, адозва белых валяецца—падымі, плякат на плоце—сарві. Усё перадай, каму трэба.

Часам могуць і рэчы розныя,—дрэнь на першы погляд, — палажэньне праціўніка выясьніць. Банкі ад консэрваў ці ад галет каробкі з ангельскім надпісам палякі пакі-

нулі, як пашлі,—вось і даведацца можна, што яны ядуць і адкуль узялі.

Трудна ўсе выпадкі пералічыць, калі кожны баец вялікую можа паслугу зрабіць, даць важныя політычныя весткі. Хто захоча, той сам патрапіць.

Параю вам яшчэ тры важных правілы запомніць. Гэта для тых, хто добрым політразьведчыкам хоча быць.

Першае. Старайся заўсёды аб патрэбным усім даведацца. Больш спрытнасьці ды кемнасьці. Умей заўсёды разабрацца, дзе карыснае для Чырвонай арміі выведаць можна. Політычная разьведка павінна адбывацца без перапынку.

Другое. Рабі сваю работу скрыта, прасьцей. Не кажы, што ты політразьведку вядзеш. Даведаюцца, з кім гавораць—і змоўкнуць, а то яшчэ і налгуць. Калі хто табе што гаворыць, старайся, каб другія ня ведалі: белагвардзейцы многа сялян і рабочых расстралялі і замучылі толькі за тое, што Чырвонай арміі весткі давалі. Не падводзь таго, хто нам памагчы хоча.

Трэцяе. Як найхутчэй старайся даставіць сваё данясеньне. Калі прамарудзіш, то часта твой даклад спозьніцца і не патрэбен ужо будзе нікому.

Вось як, таварышы, вядзецца політразьведка. Калі ня ведаеш, дзе тут сабака закопана, дык трудна здаецца, а па сутнасьці кожны зрабіць можа.

Калі мае хто пытаньні, то прашу задаваць. Бачу, што таварышу Сямёнку карціць. А, ну?

— Праўда, ёсьць яшчэ запытаньне немалаважнае. Вось вы тлумачылі наконт політразьведкі многа, але ўсё ў военны час, а я і ня ведаю, ды і Лебяда таксама цікавіцца, як цяпер політразьведку рабіць, калі спакойна ў нас. Вось на манэўрах, куды заўтра ідзем. Тут і праціўнік свой, ведаем яго, як аблупленага, ды і вёскі кругом савецкія.

— Просім растлумачыць! — падтрымалі яшчэ галасы.

— Ну, добра, — адказаў старшыня, — раскажу наастатак і гэта, ды пойдзем набакавую...

## Політразьведка патрэбна і ў мірны час.

Пэўна, у мірных абставінах, на тактычных занятках, на манэўрах, політразьведка вядзецца ня так, як на вайне. Умовы іншыя. Напрыклад, ворага выведаць зусім ня трэба. Ня будзем-жа мы дэзорганізаваць сіні бок, калі чырвоныя на занятках.

Політычная разьведка ў мірны час накіравана да дзьвюх мэт:

1) вучыцца працаваць для вайны, практыку набыць і

2) пазнаёміцца з мясцовым насельніцтвам, каб ведаць, якую політычную работу павесьці, або нават чым працоўным мы зможам памагчы.

Прыдзецца выясьніць такія пытаньні: загадана, напрыклад, сяло якое выведаць. Перш за ўсё—трэба даведацца, колькі там насельніцтва. Як жывуць сяляне—бедна ці багата, колькі беднякоў, сераднякоў і кулакоў. Якая політычная і культурная работа вядзецца сярод сялянства. Якія пытаньні цікавяць насельніцтва: вылічэньне сельгас-

падатку, крэдыт, ці можа наконт ваеннай небясьпекі кепска разабраліся.

Трэба даведацца, колькі ў сяле комуністых, комсамольцаў, з работай іхнай пазнаёміцца.

Як работа Асоавіяхэму ідзе, якія недахопы, якія патрэбы, усё гэта патрэбна для таго, каб раней ведаць, да якой політычнай работы ў сяле падрыхтавацца. А работа вядзецца ня толькі на сходах, спэктаклях ці дакладах якіх,—калі раней чырвонаармейцаў падрыхтаваць, праінструктаваць, дык яны, застанавіўшыся ў сялян, могуць таксама вельмі многа растлумачыць. Бывае падчас, што вайсковая політычная разьведка вельмі важныя матэрыялы дастае. Тады яны перадаюцца мясцовай уладзе—раённаму або акруговаму выканкому, камітэту партыі або комсамолу. Тыя таксама прымаюць належныя захады.

Летась у нашым-жа палку было такое здарэньне: скардзіліся сяляне ў аднэй воласьці, што судовыя справы ў іх доўга цягнуцца, покуль на суд выклічуць—год пройдзе, забудзеш і чаго на суд ідзеш. Паведа-

міў камісар палка ў акруговы партыйны камітэт. Праверылі, выявілася, што праўда, ну, і націснулі каго трэба. І іншую дапамогу сялянству даводзілася даваць.

У мірны час політразьведка часта высылаецца раней. Ведаем раён, куды манэўраваць пойдзем, і пасылаем туды людзей—політкіраўніка, або камандзіра з чырвонаармейцамі—пагаманіць, каб на месцы палажэньне дасьледваць.

Часам даручаецца кароткую політразьведку і кватэрным правесьці.

Спосабы політразьведкі ў мірны час таксама трохі розьняцца. Тут ужо такой скрытнасьці ня трэба. У пераважнай большасьці разьведчыкі (каму гэта даручана) прыходзяць у мясцовы савет, ячэйку партыйную ці комсамольскую—і там даведваюцца аб усім патрэбным. Апроч гэтага, зразумела, і беспасрэдна ў жыхарства шмат аб чым даведаюцца.

Перш чым скончыць, хачу я вам яшчэ адно сказаць,—і ў мірны час, а на вайне асабліва, судзяць аб арміі, якая ў ёй дысцыпліна, перш за ўсё, па разьведчыках. Яно

і зразумела: разьведка першая, наперадзе ўсяго войска, паказваецца насельніцтву. Ад таго, як разьведчыкі трымацца будуць, часта залежыць, як насельніцтва наогул спаткае нашы палкі. А вы ведаеце добра, што дужыя мы тады, калі ўсе нас любяць і паважаюць.

Дзеля гэтага разьведчык асабліва добра павінен сябе трымаць. Ветліва, уважліва да жыхарства адносіцца. Гэта кожны разьведчык заўсёды памятай! Трэба-б яшчэ расказаць...

— Таварыш старшыня, дазвольце строіць на праверку,—перабіў таварыша Вахненку дзяжурны, убегшы ў ленкуток.

— Эх, шкода! Ня ўсё разабралі...

— Нічога, заўтра не падгуляем, а там падвучымся!

# ЗЬМЕСТ

*Стар.*

У разьведку . . . . . . . . . 3
Нашто патрэбна політразьведка і дзе яе патрэбна рабіць . . . . . . . . . 9
Як памог чырвонаармеец Пятрушын цэлай арміі . 15
Чаму аднойчы нашаму аддзелу ад бандытаў папала 20
Хто робіць палітычную разьведку . . . . 26
Як трэба весьці політразьведку і якія здабываць весткі . . . . . . . . 30
Політразьведка патрэбна і ў мірны час . . . 36

TURKMENISTAN
ТУРКМЕНСКАЯ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ
БИБЛИОТЕКА

1964 г.
Бел. аддзел
1894
131
B000003115707



ЦАНА
10 кап.

Дзяржаўная бібліятэка БССР імені Леніна